**23.** Вызначце з прапанаваных просты(-ыя) сказ(-ы) з аднароднымі членамі.

*1. Лясная сцежка то зварочвала ў арэшнік, то кіравала ў гай старасвецкіх дубоў.*

*2. Снег белымі ахапкамі ляжаў на стрэхах, на яблынях і грушах, і птушкам было цяжка знайсці корм.*

*3. Удосталь наплёскаўшыся ў лужыне, верабей узляцеў і сеў на галінку грушы, каб прасушыць пер’е.*

**А)** усе сказы. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**24.** Аўтарскія заўвагі па ходзе дзеяння ў п’есе – гэта … .

**А)** маналогі. **Б)** дыялогі. **В)** палілогі. **Г)** рэмаркі. **Д)** рэплікі.

---

**25.** Вызначце з прапанаваных назоўнікі, якія ў форме роднага склону адзіночнага ліку маюць канчатак ***-у***(***-ю***).

*1) магістр; 2) гром; 3) кантраст; 4) баскетбол.*

**А)** усе назоўнікі. **Б)** няма такіх назоўнікаў. **В)** 1, 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3, 4.

---

**26.** Пра вельмі хуткае дзеянне ў народзе гавораць: “ …”.

**А)** У вочы не бачыў. **Б)** Глянуць адным вокам.

**В)** Бачылі вочы, што выбіралі, то цяпер няхай не плачуць.

**Г)** Як вока схопіць. **Д)** Як вокам маргнуць.

---

**27.** Дадзены сказы:

*1. Ён _ кампазітар. 2. Сэрца _ не камень. 3. Вёска _ рукою падаць.*

У якім(-іх) сказе(-ах) на месцы пропуску неабходна паставіць працяжнік?

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 2. **Г)** у 1, 2. **Д)** у 3.

---

**28.** “Найвялікшым духоўным багаццем народа з’яўляецца яго мова,” – сказаў вядомы беларускі мастак слова … .

**А)** Якуб Колас. **Б)** Максім Гарэцкі. **В)** Ядвігін Ш.

**Г)** Цішка Гартны. **Д)** Змітрок Бядуля.

---

**29.** Як называецца маладая кампанія, у аснове якой ляжыць інавацыйная бізнес-ідэя і тэхналогія?

**А)** блокчэйн. **Б)** байкшэрынг. **В)** каршэрынг. **Г)** стартап. **Д)** кантора.

---

**30.** Гэты вядомы ўсім мастак слова на сваім летніку пад Мінскам пабудаваў у свой час будынак-кабінет з лазы. На мастках над Свіслаччу ён паставіў імправізаваны пісьмовы стол. Такім чынам можна было складаць захапляльныя гісторыі пра вандраванні ў далёкія краіны, звесіўшы ногі ў ваду і ўяўляючы сябе на беразе мора ці акіяна. Хто гэта?

**А)** Уладзімір Караткевіч. **Б)** Янка Маўр. **В)** Васіль Быкаў.

**Г)** Янка Брыль. **Д)** Уладзімір Дубоўка.

---

КОНКУРС

Арганізатар гульні-конкурсу «Буслік» –
Грамадскае аб’яднанне «Беларуская асацыяцыя «Конкурс»

220045, г. Мінск, вул. Яна Чачота, 16 тэл. (017) 375 66 17, 375 36 23
e-mail: info@bakonkurs.by https://bakonkurs.by/ https://конкурс.бел/

Унітарнае прадпрыемства «Выдавецкі цэнтр БА «Конкурс». Заказ 5. Тыраж 6900 экз. 2023 г.

# Гульня-конкурс па беларускай мове і літаратуры «БУСЛІК-2023»

*Чацвер, 16 лютага 2023 года*

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання (10 лягчэйшых пытанняў – па 3 балы, 10 найбольш складаных – па 5 балаў, астатнія 10 – па 4 балы); складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна на яго адказалі;
- за няправільны адказ аднімаецца чвэрць балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- максімальная колькасць балаў, якой ацэньваецца заданне конкурсу, – 150, аднак аўтары задання не прадугледжваюць яго поўнага выканання ўдзельнікамі; у заданне гульні-конкурсу ўключаны пытанні, веды пра якія не прадугледжаны школьнай праграмай;
- карыстацца даведнікамі, падручнікамі, слоўнікамі, іншымі пісьмовымі або друкаванымі матэрыяламі, электроннымі сродкамі інфармацыі і сувязі забараняецца; не дазваляецца таксама абменьвацца інфармацыяй з іншымі ўдзельнікамі і задаваць пытанні настаўніку; ручка, чарнавік, картка і заданне – гэта ўсё, што патрэбна мець удзельніку;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем і чарнавік удзельнік забірае з сабой і захоўвае іх да падвядзення канчатковых вынікаў;
- вынікі ўдзельнікаў размяшчаюцца на сайце https://bakonkurs.by/ праз 1–1,5 месяцы пасля правядзення конкурсу.

---

## Заданне для вучняў 9 класа

**1.** Колькі назоўнікаў у скорагаворцы?

*Дзятлы дзюбамі дзяўблі дзеравяку.*

**А)** 0. **Б)** 1. **В)** 2. **Г)** 3. **Д)** 4.

---

**2.** Вызначце словы з прапанаваных, у якіх ёсць прыстаўка.

*1) спаўна; 2) спеласць; 3) назваць; 4) спорт.*

**А)** 1, 2. **Б)** 1, 3. **В)** 2, 3. **Г)** 2, 4. **Д)** 3, 4.

---

**3.** Колькі ўсяго слоў з ***[х]*** у вершаваных радках Максіма Лужаніна?

*Спачатку валіць на шляхі*
*То мокры снег, то снег сухі.*
*Адзін завецца Хáлепа,*
*Другога клічуць Шáлепа…*

**А)** 1. **Б)** 2. **В)** 3. **Г)** 4. **Д)** 5.

---

**4.** Дадзены сказ: *Неяк дзядуля падчас гутаркі сказаў: “Ведаеш, унучак, за пражытыя гады я зразумеў, што час заўсёды мае зайздросную асаблівасць спалучаць у сабе ўчарашняе і сённяшняе,* ***паступова*** *перакідваючы нябачны масток у заўтрашні дзень.*

Якой часцінай мовы з’яўляецца выдзеленае слова ў сказе?

**А)** назоўнікам. **Б)** прыметнікам. **В)** дзеясловам. **Г)** займеннікам. **Д)** прыслоўем.

**5.** Падбярыце з прапанаваных устойлівыя спалучэнні, якія з'яўляюцца сінонімамі да выразу ***тэт-а-тэт***.

*1) на чатыры вокі; 2) сам-насам; 3) з вока на вока.*

**А)** усе з прапанаваных. **Б)** няма такіх сярод прапанаваных.
**В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**6.** У якіх словах з прапанаваных на месцы пропуску напішаце змякчальны мяккі знак (**ь**)?

*1) кас..ба.; 2) ц..мяны; 3) сал..ца.*

**А)** ва ўсіх. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.

---

**7.** Нагляд, клопаты, апека – словы-… .

**А)** амонімы. **Б)** амографы. **В)** сінонімы. **Г)** антонімы. **Д)** паронімы.

---

**8.** Дадзены народныя выразы:

*1. Ад добрай маткі … з хаткі.*
*2. Чужына – не родная матка, хлеба … .*
*3. Мілая тая дарожка, якой я да мамы … .*
*4. Шануй маці – другой … .*

Дапоўніце выразы патрэбнымі дзеясловамі:

*а) не знойдзеш; б) не дасць; в) не бегаюць; г) хадзіла.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-а, 3-г, 4-в. **В)** 1-в, 2-г, 3-а, 4-б.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-г, 4-а. **Д)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а.

---

**9.** Прачытайце сказ:

*Я не хачу, каб цінай безгалосай заплеснеў бераг, на якім стаю* (Э. Агняцвет).

Прапанаваны сказ з'яўляецца … .

**А)** простым. **Б)** складаназлучаным. **В)** складаназалежным.
**Г)** складаным бяззлучнікавым. **Д)** складаным з рознымі відамі сувязі частак.

---

**10.** Дадзены ўстойлівыя спалучэнні:

*1) хоць вока выкалі; 2) душа ў душу; 3) куры не клююць.*

Падбярыце да іх антонімы:

*а) як кот з сабакам; б) як кот наплакаў; в) хоць іголкі збірай.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в. **Б)** 1-а, 2-в, 3-б. **В)** 1-б, 2-а, 3-в. **Г)** 1-б, 2-в, 3-а. **Д)** 1-в, 2-а, 3-б.

---

**11.** Выберыце з прапанаваных назоўнік(-і) жаночага роду.

*1) камюніке; 2) пантаніма; 3) вета.*

**А)** 1. **Б)** 1, 2. **В)** 2. **Г)** 2, 3. **Д)** 3.

---

**12.** Які жанр выбраў Ян Баршчэўскі пры напісанні твора "Шляхціц Завальня"?

**А)** паэму. **Б)** апавяданне. **В)** аповесць. **Г)** раман. **Д)** верш.

---

**13.** У якіх словах з дадзеных на месцы пропуску напішаце літару ***с***?

*1) бей..бол; 2) пя..чота; 3) перано..чык; 4) бе..казырка.*

**А)** ва ўсіх словах. **Б)** няма такіх слоў. **В)** у 1, 2, 4. **Г)** у 1, 3, 4. **Д)** у 2, 3, 5.

---

**14.** Суаднясіце выразы.

*1) не раз; 2) ні разу; 3) не адзін; 4) ні адзін.*
*а) некалькі; б) многа разоў; в) ніхто; г) ні аднаго разу.*

**А)** 1-а, 2-б, 3-в, 4-г. **Б)** 1-б, 2-г, 3-а, 4-в. **В)** 1-в, 2-а, 3-г, 4-б.
**Г)** 1-в, 2-б, 3-а, 4-г. **Д)** 1-г, 2-в, 3-б, 4-а.

---

**15.** Вызначце ў радзе "лішняе" слова.

*Дачка, дачушка, даччын, дачны.*

**А)** няма "лішняга" слова. **Б)** дачка. **В)** дачушка. **Г)** даччын. **Д)** дачны.

---

**16.** Дадзены прыклады:

*1) праязны; 2) кантрасны; 3) міласэрдны; 4) жаласлівы.*

Выберыце няправільна напісаныя словы.

**А)** усе словы. **Б)** 1, 2. **В)** 1, 3. **Г)** 2, 3. **Д)** 2, 4.

---

**17.** У якіх прыметніках з прапанаваных на месцы пропуску напішаце мяккі знак **ь**?

*1) астахан..скі; 2) снежан..скі; 3) восен..скі; 4) казан..скі.*

**А)** ва ўсіх. **Б)** няма такіх прыметнікаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 2, 3. **Д)** у 3, 4.

---

**18.** Прачытайце ўважліва сказы.

*1. Амаль увесь месяц стаяла цёплае <u>бабіна лета</u>.*
*2. Аднекуль данеслася <u>гучнае "ау"</u>.*
*3. <u>Займацца</u> спортам вельмі карысна для здароўя.*

Выберыце сказы, у якіх правільна выдзелены дзейнік.

**А)** усе сказы. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** 1, 2. **Г)** 1, 3. **Д)** 2, 3.

---

**19.** Дадзены народныя выразы:

*1. Век пражыла, хлеба з сокам не ела; хлеб ёсць – сок.. няма, сок ёсць – хлеба няма.*
*2. Без хлеба няма абед.., без капусты жываты пусты.*
*3. Не бывае агню без дым.. .*

У якім(-іх) выразе(-ах) на месцы пропуску напішаце канчатак ***-у***?

**А)** ва ўсіх выразах. **Б)** няма такіх выразаў. **В)** у 1. **Г)** у 2. **Д)** у 3.

---

**20.** На якой мове Мікола Гусоўскі напісаў сваю паэму "Песня пра зубра"?

**А)** на беларускай мове. **Б)** на рускай мове. **В)** на польскай мове.
**Г)** на лацінскай мове. **Д)** на італьянскай мове.

---

**21.** Якое слова прапушчана ў народнай прыказцы?

*Без прыкмет не будзе хлеба на … .*

**А)** восень. **Б)** сям'ю. **В)** сустрэчу. **Г)** абед. **Д)** зіму.

---

**22.** У якіх сказах з дадзеных дапушчаны памылкі?

*1. Я падзякаваў сяброўку за дапамогу. 2. Мы з татай хадзілі ў заапарк.*
*3. Янка сустрэўся з Вовай і Віцей.*

**А)** ва ўсіх сказах. **Б)** няма такіх сказаў. **В)** у 1, 2. **Г)** у 1, 3. **Д)** у 2, 3.